**В. Дз. Фіцкевіч**

# УЗРОСТ І НАВУЧАННЕ: ПРАКТЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ ВЫКЛАДАННЯ ЗАМЕЖНАЙ МОВЫ

Звыйчайна, калі чалавек чуе слова “педагог”, у яго галаве ўсплываюць у асноўным вобразы чалавека, які працуе з дзецьмі. Але ж далей мы пачынаем разумець, што педагогі займаюцца з людзьмі розных ўзростаў. Але ці ёсць значная розніца паміж успрыманнем матэрыяла ў дзяцей і дарослых? Як гэта раскрываецца ў практычных аспектах выкладання?

Крыніцамі матэрыялу нашага даследавання з’яўляецца дзяўчынка 6 гадоў, дзяўчына 13 гадоў, група людзей (А) колькасцю 11 чалавек ва ўзроставай катэгорыі 18–21 гадоў, група людзей (Б) колькасцю 9 чалвек ва ўзротавай катэгорыі 60–65 гадоў.

У задачы ўваходзіла зразумець, ці сапраўды ёсць значная розніца ў вывучэнні замежнай мовы дарослымі і дзецьмі на базе розных фактараў (такіх як выкананне дамашняга задання, засваенне новых словаў і іх выкарыстоўванне, колькасць часу, які надзяляецца мове па-за межамі заняткаў з выкладчыкам).

Амаль поўнае выкананне дамашняга задання, якое судзейнічае замацаванню матэрыяла, пройдзенага на ўроку, было выяўлена ў групах А і Б, тым часам як дзяўчына падлеткавага ўзросту выконвала замацоўваючы матэрыял на 40 адсоткаў (дзяўчыне малодшага школьнага ўзросту падобныя заданні для самастойнай работы не даваліся). Засваенне новых словаў, якое суправаджалася актыўным выкарыстаннем у практыкаваннях і размовах (у колькасці 5–7 штук для 6-гадовай дзяўчыны, 5–10 штук для 13-гадовай дзяўчыны, 8–15 штук для групы А і 8–15 – для групы Б), было хуткім працэсам для дзяўчат 6 і 13 гадоў, групы А. У тый час як група Б не змагла паказаць высокіх вынікаў, так як пры затрачванні большых намаганняў, далейшае выкарыстанне словаў не было актыўным.

Апытанне, праведзенае ў мэтах выяўлення, колькасці вучняў, якія надзяляюць час замежнай мове ў вольны час (у выглядзе чытання і аўдзіравання падчас забаўляльнага кантэнту), паказала, што гэтым займаюцца 60 адсоткаў групы А і 30 адсоткаў групы Б. Дзяўчаты малодшага школьнага ўзросту і падлеткавага ўросту не надзялялі час мове па-за межамі класа.

Спалучаючы вышэй указаныя дадзеныя, намі было выяўлена, што пры мінімальных затратах энэргіі і сілаў група школьнікаў паказвае дадзеныя вышэй за групу Б, але ніжэй за групу А. А менавіта:

Група А > 6 гадоў > 13 гадоў > Група Б

Мы не можам адмаўляць уплыў асабістых фактараў кожнага з вучняў, якія прынялі ўдзел у даследаванні, але можам заўважыць, што для кожнай з груп патрэбны розныя падыходы дзеля ўзняцця эфектыўнасц.